канф., прысвеч. 500-годдзю выдачы г. Мінску граматы на магдэбург. права, (Мінск., 26 сак. 1999 г.) / Беларус. дзярж. ун-т, Акад. М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь, Беларус. недзярж. ін-т правазнаўства; рэдкал.: У.М. Хоміч [і інш.]. – Мінск, 1999. – С. 35–39.
11. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. /М.П. Касцюк [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1994 – 1995. – Ч. 1 – 527 с.
12. Пичета, В.И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве / В.И. Пичета; Под ред. В.И. Королюка и [др.]. – М.: Изд-во АН СССР, 1958. – 545 с.
13. Пичета, В.И. Белоруссия и Литва в XV – XVI вв. Исслед. по истории соц.-экон., полит. и культур. развития / В.И. Пичета; Под ред. З.Ю. Копысского и [др.]. – М.: Изд-во АН СССР, 1961. – 812 с.
14. Пичета, В.И. История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии. Ч. 1: До конца XVI в. / В.И. Пичета. – Минск: Изд-е Наркомзема, 1927. – Микрофильм. – 26 см.
15. Сокал, С.Ф. Гістарычныя асаблівасці ўзнікнення і станаўлення прававога рэгулявання гаспадарчых адносін у Беларусі ў дасавецкі перыяд / С.Ф. Сокал // Сац.-экан. і прававыя даслед. – 2012. – № 2. – С. 4 – 13.
16. Статут Великого княжества Литовского 1529 г. / Под ред. акад. АН Литовской ССР К.И. Яблонскиса. – Минск: Изд-во АН БССР, 1960. – 254 с.
17. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / Пер. на сучасн. бел. мову А.С. Шагун. – Мінск: Беларусь, 2010. – 207 с.
18. Цітоў, А.К. Менск – месца майстроў. Рамесныя цэхі XVI – XVIII стст. / А.К. Цітоў. – Мінск: “Беларусь”, 2002. – 110 с.

Паршанкоў А. А.
БДУ (Мінск)

## Цуды ў летапісанні Вялікага Княства Літоўскага XV – пачатку XVI стагоддзяў. Спробы класіфікацыі

Мінулае стагоддзе характэрызавалася для беларускай гістарыяграфіі станаўленнем трывалых поглядаў на гістарычнае развіццё краіны, паглыбленнем і пашыреннем ведаў аб яе мінулым. Беларускія



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

гісторыкі здзейснілі даўнюю патрэбу беларускага народа – сфарміравалі нацыянальную гістарычную школу. Пры гэтым такім цікавым і неадназначным пытанням, як праблемы інтэлектуальнай гісторыі, амаль не надавалася ўвагі. Тэма “Цуды ў летапісанні Вялікага Княства Літоўскага” увогуле не распрацаваная і таму патрабуе вялікай увагі ад даследчыкаў. Дзеля таго, каб зразумець нашых продкаў, трэба разгадаць і растлумачыць усё, што яны пакінулі нам. Таму без разумення сэнсу цудаў, прычын іх з’яўлення ў летапісанні, а таксама знікнення з яго, мы рызыкуем памыліцца ў нашай рэканструкцыі мінулага. Дадзеная невялічкая праца – спроба пачаць даследваць цуды летапісання Вялікага Княства Літоўскага, менавіта таму адной з задач яе стаіць класіфікацыя дзівосных з’яўленняў. Літаратуры па тэме не шмат, галоўныя працы, якія могуць быць выкарыстанымі дзеля прыкладу даследвання аналагічных з’яваў, належаць Жаку Ле Гофу.

У сваім зборніку артыкулаў “Сярэднявечны свет уяўнага” (“L'Imaginaire médiéval”) Жак Ле Гоф дае шырокі спіс цудоўных з’яваў, што мелі месца на тэрыторыі Дафінэ ў XIII ст. Таксама ён прывёў там класіфікацыю цудоўнага для сярэднявечнага Захаду[1]. Схематычна яна выглядае так:

1. Miraculosus – хрысціянскае цудоўнае (сам цуд – miracle).
2. Magicus – цудоўнае д’ябла, сатанінскае звышнатуральнае.
3. Mirabilis – цудоўнае з дахрысціянскімі каранямі.

Вопыт гэтага знакамітага навукоўца можа быць вельмі карысным для айчыннай гістарыяграфіі.

Шчыра кажучы, летапісы ВКЛ небагатыя на цуды. Асновай для тагачаснага інтэлектуала была старажытнаруская традыцыя, менавіта таму можна казаць аб адзінай прасторы цудаўспрымання з XI па першую палову XVI стагоддзяў. Зразумела, што схемы, распрацаваныя папярэднікамі ў адносінах да цудоўнага, дзейнічалі і на больш познем матэрыяле, бо ў іншым выпадку інтэлектуалы-летапісцы ВКЛ не ўключалі б у свае тэксты незвычайныя здарэнні, што мелі месца амаль чатыры стагоддзі таму. Заходнееўрапейскія традыцыі (гэта тычыцца і цудоўнага) амаль не закранулі летапісцаў ВКЛ менавіта з-за наяўнасці моцных старажытнаславянскіх каранёў.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Дзеля таго, каб лепш зразумець цуды летапісання Вялікага Княства Літоўскага, трэба стварыць уласную іх класіфікацыю. Для прыкладу не блага было б скарыстацца напрацоўкамі французкай “Школы Аналаў”. На вялікі жаль для нас, поўнасцю аналагічная “легофаўскай” класіфікацыя на матэрыяле Вялікага Княства Літоўскага працаваць не будзе, па прычыне рознага паходжання цудаў. Нягледзячы на гэта, летапісы ВКЛ з’яўляюцца добрай глебай для даследванняў у дадзеным накірунку. Напрыклад, вялікім сховішчам цудаў з’яўляецца “Валынскі кароткі летапіс”. Іншыя летапісы таксама даюць магчымасць часткова прымяняць да іх метады французскіх медыевістаў.

Адзначым, што больш напоўненымі цудамі з’яўляюцца пачаткі летапісаў, старажытнейшыя па даце напісання. Позні фрагменты тэксту, наадварот, усе менш і менш абмаўляюцца пра дзівосы. Гэта мела месца з-за вялікіх змен у свядомасці інтэлектуалаў, якія адбыліся ў XVI стагоддзі.

Я лічу неабходным даць тут прыблізную класіфікацыю цудоўных з’яваў у Вялікім Княстве Літоўскім, якая мне падаецца лагічнай, на падмурку класіфікацыі Ле Гофа. Катэгорыі стануць крыху іншымі, а некаторыя французскія ўвогуле будуць адсутнічаць.

Самае галоўнае, што трэба ўлічваць пры стварэнні класіфікацыі цудоўнага летапісаў ВКЛ – гэта ярка выяўлены хрысціянскі характар.

Да першай катэгорыі трэба аднесці з’явы, ***непасрэдна звязаныя з культам***. Да першай групы гэтай катэгорыі адносяцца незвычайныя абразы, якія міраточаць, струменяць кроў. Звесткі аб жывых абразах мы знаходзім пад 1405 годам: “Того жь лета бысть на Москве чюдо: в дому Тутромове от иконы святыя Богородици и святого чюдотворца Николы изыиде миро изо образа” [2, стар. 53]. У 1407 таксама: “Бысть знамение на Поръхе: иде кров от иконы святыя Богородици”[2, стар. 54].

Нягледзячы на тое, што цуды адбываліся не ў ВКЛ, яны ўсё роўна ўключаны ў адзіную прастору ўяўнага, цікавяць інтэлектуала.

Да наступнай групы цудаў катэгорыі 1 адносім тыя незвычайныя “жывыя” рэчы, якія маюць здольнасць вылечваць людзей. Сюды аднясем і абразы, і святыя мошчы. У 1414 годзе адбылося наступнае: “Того жь лета сотворися знамение…в Колочи: от иконы святыя Богородици явися



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

чюдо, много прощение слепым и хромымь и раслабленымь, еже не може умь человечи сказати"[2, стар. 55]. Іншы выпадак: "Тогое же зимы бысть чюдо у гроба святого Петра митрополита: жена некая 2 лета без ногу лежала, и бысть прощена" [2, стар. 103]. Апошні прыклад: "Простил бог во церкви святеи Богородицы…некоему человеку нога прикръчена отнюд и исцели у гроба святого Петра" [2, стар. 47].

***Надзвычайныя з'явы прыроды***, на мой погляд, адносяцца да другой катэгорыі цудаў. "На ту же зимы бысть знамение на небеси страшно, яко приходить облаком кровавым во нощех, и се бысть на многи зимы" [2, стар. 104]. Да 1365 года мае дачыненне такі цуд: "Того жь лета бысть знамение во солнци, аки гвоздие черно, а мгла 2 месяци стояла" [2, стар. 48]. Прыблізна ў 1370 годзе: "На многи нощи быша знамение по небу, яко столпы…", пасля была лютая зіма, а неўзабаве "на Николин день" пад Масквой з'явіўся Альгерд [2, стар. 105]. 1400 год: "Того жь лета бысть знаминие н[а] небеси и помрачение во солнци, и тма бысть, и явися серп на небеси, и явися солнце крываво и луча испущая месяца октобрия" [2, стар. 52]. 1402 год: "Во великое говение месяца марта знамени бысть на небеси: явлъшюся во вечерьную зару на западе звезда велика аки копеинымь образомь явльшеся, верьху же ея яко луча сияше, иже на востоце восходящи, на западе летнемь явлынеся, юже видихомь все говение великое в пятьницю великую. Идяше та же звезда весь день пред слнцемь, вси ми видихомь ея идуще" [2, стар. 52]. "Того же году на Благовещение в понеделник на страстнои недели было знаме великое: яко бы в обед время звезды явилися, как бы в полночи, и солнце потемнело, и страх был великии на землю Рускую. Того ж лета Москва згорела и Смоленск" [2, стар. 209]. Неабходна адзначыць, што тлумачэнне прыродных з'яваў таксама шукаецца летапісцам у рэлігіі.

Некаторыя асобныя незвычайныя з'явы прыроды напрамую нельга назваць цудам. Гэта тычыцца, напрыклад, лютай зімы 1443 года, землятруса ў 1445. У такіх з'яўленнях няма нічога дзіўнага, але трэба адзначыць, што летапісы амаль заўсёды побач з дрэннай з'явай прыроды падаюць нейкія сацыяльныя катастрофы, пажары і інш. Гэта сведчыць пра тое, што такія падзеі ўспрымаліся як Божы знак і Божае пакаранне,



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

іх можна аднесці да складанай і неадназначнай катэгорыі “звычайны прыродны цуд”.

Цікавасць маюць для нашай працы і ***з’яўленні святых***, што адносяцца да трэцяй катэгорыі. У Супрасльскім летапісе пад 1240 годам знаходзім: “И пребысть всю нощь во обьдениих, яко же нача восходити солнце, и услышавшимь страшны по мору, и види насад гребущь, и посреди насада стоящи Бориса и Глеба в одежах червенах, и беста руки дерьжащи на рамех, гребци же седящи акы во молни одени” [2, стар. 43]. У наступным выпадку мы бачым ужо дзеянне анёлаў, якія вельмі рэдка фігуруюць у летапісанні: “Бысть же чюдо тогда: победи Алексаньдрь карабли, а они об онь поль реки Ижеры, идеже не бе проходно полку Александрову, и зде обретоша множество мертвых, избиеных от ангель божиих” [2, стар. 44].

Знакамітым стаў летапісны сюжэт пра заснаванне Гедымінам Вільні. Быццам бы, вялікі князь бачыў сон, у якім адзін жалезны воўк на высокай гары выў як сотня ваўкоў, а здарылася гэта на тым самым месцы, дзе стомлены князь вырашыў адпачыць пасля палявання на незвычайна вялікага тура. Тлумачыць сон прывялі Ляздзейку, дзіўнага чалавека, што быў знойдзены ў арліным гняздзе [2, стар. 153]. Ён прадказаў князю з’яўленне вялікага горада.

Гэта ўжо прыклад цудаў чацвертай катэгорыі. У ёй злучаюцца дзве “легофаўскія” групы: ***magicus*** – цуды д’ябла, сатанінскае звышнатуральнае і ***mirabilis*** – цуды з дахрысціянскімі каранямі. Язычніцкія матывы змешваюцца ў нашым выпадку з сатанінскім цудоўным, і не заўсёды можна аддзяліць адно ад другога. Каб падмацаваць думку аб гэтым прывядзем цуд XI стагоддзя, які адлюстраваны ў “Валынскім кароткім летапісе”. “В сия же времена бысть детищь въверьжень в Сетомль, сего же детища извлекоша рыболове в неводе, его же позоровахом до вечера, и пакы въверъгоша его в воду. Бяше сии детищь: на лици ему срамнии удове, а инаго нелзе сказати срама ради. Пред сим же временем солнце пременися и не бысть светло, но яко и месяць, его же невегласи глаголать: «Сиеда ему сущю»”[3, стар. 362].



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Гэты ўрывак, які сведчыць пра з’яўленне нейкага незвычайнага стварэння, дапаўняецца гістарычнымі ведамі летапісца, што знайшоў у мінулым падобныя прыклады. Бачым цэлы комплекс думак, звязаных з цудам. Абгаворваюцца прычыны з’яўлення, робяцца высновы аб тым, чаго чакаць праз хуткі час. “Знамениа бо в небеси или в земли, или в звездах, или в солнци и луне, или етеромь чим не благо бывають; или рати, или глад, или смерть проявляють” [3, стар. 362] .

Ітак, падагульняючы сказанае, вылучым класіфікацыйную схему цудаў летапісання Вялікага Княства Літоўскага.

Катэгорыя 1. Цуды, непасрэдна звязаныя з культам.

А. “Жывыя” абразы, якія міраточаць і струменяць кроў.

Б. Святыя мошчы, абразы-цудатворцы. Галоўнае, што гэтыя надзвычайныя рэчы могуць ісцэляць.

Катэгорыя 2. Цуды, звязаныя са з’явамі прыроды.

А. Надзвычайныя прыродныя з’явы: затменні, аблокі рознага колеру, нябесныя знакі, каметы, вогненыя слупы.

Б. Звычайныя з’явы прыроды, якія трактуюцца летапісцам як звязаныя з Богам падзеі, ці пасля якіх істотна пагаршаецца сітуацыя ў рэгіёне, прычым пагаршэнне гэтае, часам, не залежыць непасрэдна ад самой з’явы.

Катэгорыя 3. Цудоўныя з’яўленні. Дапамога святых, анёлаў.

Катэгорыя 4. Дзівосныя падзеі, напрамую не звязаныя з Богам.

А. Язычніцкія цуды, дахрысціянскае цудоўнае.

Б. Антыхрысціянскія цуды. Сатанінскае цудоўнае.

Распрацаваная схема дазваляе нам класіфікаваць цудоўнае летапісаў ВКЛ. Мы можам, як глыбей даследваць і аналізаваць цудоўныя з’явы, так і паспрабаваць зразумець прыроду цудаў у летапісанні.

У ходзе даследвання высветлілася, што класіфікацыя Ле Гофа можа з поспехам прымяняцца для працы з цудамі летапісаў Вялікага Княства Літоўскага. Усе тры ягоныя катэгорыі знаходзяць прыклады ў нашым летапісанні.

Але, па-першае, колькасць цудаў, з’яўляючыся вельмі абмежаванай, не дазваляе ім быць выразна падзеленымі паміж катэгорыямі. Па-другое,



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

большасць цудаў адбываецца не на тэрыторыі ВКЛ і храналагічна не ў рамках існавання гэтай дзяржавы.

Што тычыцца трактоўкі цудаў, то яна падаецца зразумелай: летапісцы ўспрымалі цуды, як Божыя знакі, што часцей за ўсё прадказвалі няшчасце. Такі варыянт быў самым пашыраным, але не адзіным, увогуле, гэта тэма для будучых даследванняў.

Можна заўважыць вялікія змены ў летапісанні ВКЛ XVI стагоддзя, якія характарызуюцца разам з адыходам ад старажытнарускай традыцыі поўным знікненнем цудаў з нарратыва. Замест цудоўных уяўленняў інтэлектуалы знаходзяць новую форму сваёй творчай дзейнасці. Вострая і напружаная інфармацыйная барацьба кінула ўсе сілы летапісцаў на даследванне сваіх каранёў і абгрунтаванне рымскага (італьянскага) паходжання.

Цудоўнае замяняецца цалкам выдуманымі легендамі, якія абаранялі і падмацоўвалі думкі інтэлектуалаў. Цуды ж былі спробай зразумець іншы і свой свет, працягнуць працу папярэднікаў па асэнсаванню прыроды і чалавека. На жаль, летапісанню нашых земляў гэта не ўдалося. У Вялікім Княстве Літоўскім не атрымалася стварыць свой уласны погляд на цуды. Увогуле, цудоўнае не было тут папулярным, не знайшло глебы і не ўкаранілася.

Вельмі хутка інтэлектуалы Вялікага Княства Літоўскага ўступілі на цяжкі і супярэчлівы, але між тым і цікавы шлях: летапісанне перайшло на польскую мову, старажытнаславянская традыцыя была страчана.

**Літаратура**

1. Ле Гофф, Ж. Средневековый мир воображаемого / Ж. Ле Гофф // Библиотека Гумер – гуманитарные науки [Электронный ресурс] / Режим доступа: http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/History/Goff_SrMir/. – Дата доступа: 19.05.2017.

2. Полное собрание русских летописей. Т. 35. Летописи белорусско-литовские / [сост. и авт. предисл. Н. Н. Улащик] / АН СССР, Ин-т истории СССР. – Москва: Наука, 1980. – 306 с.

3. Летапісы і хронікі Беларусі. Сярэднявечча і раннемадэрны час / уклад. В. А. Варонін. – 2-е выданне. – Смаленск: Інбелкульт, 2013. – 902 с.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm